# Дыялог са стагоддзем
# «Час, апалены вайной»

**Г. І. Козел,**
настаўнік пачатковых класаў
вышэйшай катэгорыі
Падароскай СШ Ваўкавыскага раёна

*"Дыялог са стагоддзем" – пазнавальная гульня, падчас якой удзельнікі вядуць імправізаваны дыялог з прадстаўнікамі іншых стагоддзяў. "Дыялог са стагоддзем" – гэта адна з новых форм выхаваўчай работы ў школе. "Дыялог са стагоддзем" грунтуецца на фактах, якія прыводзяцца падчас гульні аб асобах, поглядах, дасягненнях ("прадстаўніка"). Значным з'яўляецца тое, што ў пазнавальнай гульні могуць удзельнічаць падлеткі (9-12 гадоў) і бацькі, якія таксама з'яўляюцца прадстаўнікамі часткова таго стагоддзя, аб падзеях якога будзе ісці гаворка, бо нарадзіліся ў XX стагоддзі, жывуць у XXI. Яны маюць пэўны вопыт і пэўныя веды, што спрыяе набыццю вопыту малодшымі. Камандам налічваюцца балы, перамагае каманда, якая набрала больш за ўсіх балаў.*

**Вядучы 1:** Дарагія сябры, мы пачынаем гульню "Дыялог са стагоддзем", і сёння нашай увазе прапануецца XX стагоддзе, якое было насычана рознымі знакавымі падзеямі, якія ўвайшлі ў гісторыю чалавецтва і застануцца ў ёй назаўжды. У ТОП-20 найвялікшых падзей мінулага стагоддзя ўвайшлі падзеі Вялікай Айчыннай вайны. На досвітку 22 чэрвеня без папярэджання і абвяшчэння вайны, разарваўшы тым самым мірны дагавор, нямецкія войскі ўварваліся на тэрыторыю Савецкага Саюза. Гітлер не хацеў прызнаваць іншыя нацыянальнасці, на яго думку, яны павінны былі альбо падпарадкавацца яму і стаць рабамі, альбо памерці. Такі парадак кіравання дзяржавай называецца фашызмам. Яўрэі, рускія, беларусы, палякі, французы і многія іншыя нацыі падвергліся ганенням, бо яны не збіраліся падпарадкоўвацца фашысцкаму рэжыму Гітлера.

Той самай раніцай, 22 чэрвеня, першымі ў чарзе аказаліся нашы з вамі продкі. Фашысцкая Германія, пераступіўшы мяжу, напала на Савецкі Саюз.

**Вядучы 2:**

Той самы страшны год стагоддзя.
Беларусь. Нядзельны дзень
Прынес агульную трывогу,
І поўны жах у вачах людзей.

### Дыялог 1

**Вядучы 1.** Ітак, на экране застаўка. Што абазначае выява **"1941"?** *( колькасць адказаў – колькасць балаў)*

(*Гэта быў  суровы ваенны 1941 год. На абарону нашай Радзімы ўсталі ўсе. І хай сілы былі няроўнымі, але кожны думаў толькі пра адно – не даць Гітлеру зламаць баявы дух. Кожны марыў абараніць сваю краіну. У вайне ўдзельнічалі і дарослыя, і дзеці).*

**Вядучы 2:** Пытанне 1 да каманд: “На малюнку вы бачыце лічбы. З даўніх вякоў кожная лічба абазнае нейкую колькасць прадметаў, нейкі “знак” і т.д. Прыпомніце  выказванні  народнай мудрасці ( пагаворкі ці прыказкі), дзе ёсць дадзеныя лічбы. Якая лічба самая актуальная і “любімая” ў беларускага народа? *( адказы вучняў і бацькоў, адна прыказка – 1 бал). Дадатак 1.*

**Дыялог 2**

**Вядучы 1.** У перыяд Вялікай Айчыннай вайны галоўным спосабам сувязі паміж ваенным і грамадзянскім насельніцтвам былі лісты. І, вядома, калі гаворка заходзіць аб палявой пошце, мы ўспамінаем знакамітыя пажоўклыя лісты, складзеныя трохвугольнікамі **(выява 2).**

**Вядучы 2.**

З этыкетак тоненькіх,
для пісання годненькіх,
для бацькоў, для Насценькі –
пісьмы-трохвугольнікі,
франтавыя ластаўкі. (А.Мацулевіч)

Пытанне: Чаму лісты з фронту былі без канвертаў і складваліся ў гэткую незвычайную форму ( адказы вучняў і бацькоў).

*(Даволі хутка ў час вайны стала праблема наяўнасці саміх канвертаў. Улічваючы велізарныя аб'ёмы лістоў, іх проста не паспявалі вырабляць у патрэбнай колькасці. Акрамя таго, папяровым фабрыкам банальна не хапала сыравіны. Менавіта ў гэтых умовах своечасова выявілася легендарная народная армія. На думку даследчыкаў і нават асабістых сведчанняў маршала Жукава, менавіта салдаты Чырвонай Арміі знаходзілі выхад з сітуацыі, якая склалася. Спачатку яны ўласнаручна майстравалі канверты з газет, а калі і іх перастала хапаць, проста сталі складаць свае лісты ў трохвугольнікі).*

**Вядучы 2:** Ітак, заданне групам: Скласці ваенны трохвугольнік па памяці (практычная работа, *дадатак 2, правільнасць – 3 балы*).

**Дыялог 3**

**Вядучы 1:** Увага на экран:  што абазначае дадзеная выява і якая норма прадукта выдавалася згодна прайс-ліста? *(правільны адказ – 3 балы)*

**Вядучы 2:** Самым вядомым з'яўляецца ўвядзенне хлебных картак у гады Вялікай Айчыннай вайны. Карткі былі ўведзеныя   18 ліпеня 1941 года, норма складала 800 грамаў хлеба. 2 верасня 1941 года нормы былі зніжаны: рабочым і інжынерна-тэхнічным работнікам — па 600 грамаў, служачым — па 400 грамаў, дзецям  — па 300 грамаў.

**Дыялог  4**

**Вядучы 1:**  Амаль чатыры  гады  ўся краіна супрацiўлялася нацiску працiўнiка, абараняючы свае сем'i, зямлю, Айчыну. Менавiта таму вайна

мае такую назву – Вялікая Айчынная вайна 1941-1945 гг.Самая страшная вайна, якая забрала каля 2 мільёнаў жыццяў беларускіх грамадзян. Традыцыйна з тых часоў Дзень Перамогі святкуецца 9 мая. У гэты дзень мы віншуем усіх ветэранаў, якія абаранялі Радзіму, схіляем перад імі калені і дзякуем ім за гераічны ўчынак, здзейснены дзеля таго, каб мы з вамі жылі ў мірны час. У гэты дзень успамінаюцца тыя гаротныя падзеі вайны. Гэта святое свята для ўсіх – Дзень Вялікай Перамогі!

**Вядучы 2:** Расказваючы пра герояў вайны, трэба згадаць пра тое, што героямі былі не толькі асобныя людзі, але і цэлыя гарады. Трынаццаць гарадоў сучаснай Расіі, Украіны і Беларусі носяць ганаровыя званні гарадоў-герояў. Насельніцтва гэтых гарадоў праявіла нябачны гераізм і мужнасць у гады вайны. Увага на экран: што хочуць “сказаць” Гарады-героі? *( дадатак 4)*

**Дыялог 5**

**Вядучы 1:** У кожнай краіны есць звесткі абмежаванага характару, якія называюцца?.. (увага на экран) ваеннай тайнай: звесткі ваеннага характару, якія спецыяльна ахоўваюцца дзяржавай. Ітак, у дадзеным дыялогу з “прадстаўніком” удзельнічаюць пары “бацька-сын”. Ім выдадзены карткі з двума колерамі: зялёны – сцвярджальны адказ (1 бал), чырвоны – адмоўны ( 0). (*На экране паяўляюцца пытанні, перамагае тая каманда, якая набрала больш балаў у звязцы “бацька-сын”, дадатак 5):*

**Вядучы 1:** А зараз дыялог падыходзіць да завяршэння. Актуальнае журы падводзіць вынікі.

**2023 год** – Год стварэння і міру. Гэты год таксама ўвойдзе калісьці ў нашу гісторыю. Тыя, хто перажылі Вялікую Айчынную вайну, разбурэнне і голад, страх, страту родных і блізкіх, кажуць так: “ Галоўнае, каб не было вайны.... Беражыце мір, ён такі далікатны”. Мір і яго стварэнне – тое, дзеля чаго мы ўсе прыйшлі ў гэты свет. Мы прыйшлі ствараць, паляпшаць рэальнасць не толькі нашу, але і рэальнасць людзей, якія нас акружаюць!

**Вядучы 2:**

Спыніце гнеў, скажыце злосці :"Годзе!",
Не парушайце мірны рух зямны.
Імкніцеся, каб хоць адно стагоддзе
Еўропа не стагнала ад вайны.
Не трэба ў спрэчках браць у рукі зброю,
Без зброі можна ісціну знайсці…
Каб кожны чуў шчаслівы смех дзіцяці
І не зважаў, што будзе і калі,
І зразумеў: сапраўднае багацце –
Любоў пад мірным небам на зямлі. (А. Ведзянееў)

**Дадатак 1**




1. Адной рукой у далоні не пляснеш. Адзін у полі не воін. Адна галава –добра, а дзве – яшчэ лепш".Адно сёння лепш двух заўтра. Адзін у полі не воін.Адзін у моры не рыбак. Сем бед – адзін адказ. Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго. Лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуцьу. У пакуце адзін клопат – не стаяла б праца. Ад вялікага да смешнага – адзін крок.

4. Без троіцы дом не будуецца, без чатырох кутоў хата не будуецца. Дом аб чатырох кутах. Жыць у чатырох сценах. На ўсе чатыры бакі. Чалом – чатыром, а пятаму – дапамагай бог.

9. Добрая зямля падкормку раз прыме, ды дзевяць гадоў памятае. Квас малады, ды наліты дзевятай вадой. Усім па сем, гаспадару восем, гаспадыні дзевяць, што роўна дзеліць. Дзевяць чалавек – усё роўна, што дзясятак. За трыдзевяць зямель, у трыдзявятым царстве. Дзявяты вал.Саступіўшы аднойчы, дзевяць разоў застанешся ў выйгрышы.

**Дадатак 2**

Схема салдацкага трохвугольніка



**Дадатак 3**



**Дадатак 4**

Брэсцкая крэпасць першая прыняла ўдар вайны. Ранняй чэрвеньскай раніцай 1941 года нямецкія самалёты разбамбілі пагранічны Брэст. Мірныя людзі ў адзін момант сталі байцамі. Апынуўшыся ў асяроддзі без боепрыпасаў і харчавання, яны трымалі абарону амаль месяц. Усе загінулі, а подзвіг пагранічнікаў Брэста стаў вядомы на ўвесь свет.

Мінск трапіў у цэнтр бітваў з самага пачатку вайны. Амаль тыдзень горад абараняўся, але вымушаны быў здацца. Мінск жыў ва ўмовах жорсткай акупацыі, тысячы людзей загінулі. Людзі не здаваліся без бою, і за праяўленую доблесць 8 мінчан атрымалі вышэйшую ўзнагароду – званне Героя Савецкага Саюза

**Дадатак 5**

ВОЕННАЯ ТАЙНА

Ветэран – гэта стары, вопытны воін? (Так)
Кухар у войску – гэта кок? (Не)
Маёр – старэйшы па званні, чым капітан? (Так)
Пісталет – гэта рэвальвер? (Не)
Вадалаз – гэта той, хто заўсёды шукае скарбы? (Не)
Руль у самалёце і на караблі называюць штурвал? (Так)
Компас – гэта прыбор для вымярэння адлегласці? (Не)
Быць на пасту – значыць знаходзіцца ў дазоры? (Так)
Пазачарговы нарад – гэта павышэнне салдата па службе? (Не)
Галаўны ўбор дэсантнікаў – бярэт? (Так)
Патруль – гэта ўмоўнае сакрэтнае слова? (Не)
Шпіталь – гэта бальніца для вайскоўцаў? (Так)
"Кацюша" – гэта аўтамабіль, названы ў гонар усіх дзяўчат па імені Каця? (Не)
У мірны час салдаты служаць 6 месяцаў? (Не)
Папаха – гэта галаўны ўбор ўсіх татаў, хто служыў? (Не).